Чытаць кросенс трэба зверху ўніз і злева направа (як традыцыйнае чытанне), далей трэба рухацца толькі наперад і заканчваць на цэнтральным пятым квадраце. Такім чынам атрымліваецца ланцужок загорнуты як слімак (улітка). Пачаць можна як з першага, так і з любога вядомага малюнка. Можна пранумараваць клеткі загадзя, каб дзеці не заблыталіся. Вучні павінны зразумець яго сэнс, крыху расказаць пра яго, далей устанавіць лагічную сувязь з наступным малюнкам, таксама распавесці пра яго. І гэтак далей, пакуль не дабяруцца да цэнтральнага квадрата, і не завершаць сваё апавяданне самым галоўным фактам.

Метад кросенсу дапамагае развіваць крытычнае і лагічнае мысленне малодшых школьнікаў, арганізоўваць работу ў групах, рабіць урокі беарускай мовы і літаратурнага чытання цікавейшымі і спрыяе лепшаму засваенню і запамінанню матэрыяла.

**Заключэнне.** Выкарыстанне візуальных сродкаў і метадаў у адукацыйным працэсе садзейнічае актывізацыі разумовай і пазнавальнай дзейнасці. У школьнікаў павялічваецца дапытлівасць і цікавасць да творчай дзейнасці, інтэнсіўна развіваюцца ўсе псіхічныя працэсы, крэатыўнасць і ініцыятыўнасць. Аднак такая інфармацыя не можа зводзіцца проста да дэманстрацыі, яна павінна актывізаваць навучальна-пазнавальную дзейнасць малодшых школьнікаў. Такі падыход патрабуе ад выкладчыка змены традыцыйных наглядных сродкаў навучання.

1. Дубоўская, В. Візуалізацыя як правакацыя / В. Дубоўская // Настаўніцкая газета. – 22 студзеня 2022. - С. 5–7.
2. Лапшева, Е.Е., Храмова М. В. Развитие визуальной грамотности обучаемых средствами информационно – коммуникационных технологий// Психолого-педагогический журнал Гаудеамус. – 2011. – №18. – С.53–56.

## АСНОВЫ ФАРМІРАВАННЯ ЭКАЛАГІЧНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ ПРА ЖЫВЁЛ, ЗАНЕСЕНЫХ У ЧЫРВОНУЮ КНІГУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, У ДЗЯЦЕЙ У ІНТЭГРАВАНАЙ ГРУПЕ

*Т.С. Кухарэнка, Н.В. Амасовіч, Ж.П. Чобат*
*Віцебск, ВДУ імя П. М. Машэрава*

Экалагічная сітуацыя ў свеце і ў Рэспубліцы Беларусь вызначае вострую неабходнасць у фарміраванні экалагічнай культуры асобы. У Кодэксе “Аб адукацыі Рэспублікі Беларусь” экалагічная накіраванасць адукацыі ўведзена ў ранг прынцыпу дзяржаўнай палітыкі, якая прадугледжвае фарміраванне экалагічнай свядомасці, экалагічнай культуры асобы дзіцяці [1].

Праблеме фарміравання уяўленняў пра жывёл прысвечана нямала даследаванняў С.Н. Нікалаявай, П.Г. Самарукавай і інш. вядомыя таксама працы Л.П. Моладавай, І.А. Камаровай, О.О. Пракопавай, А.А. Петрыкевіч і інш., якія распрацавалі агульнатэарэтычныя і метадалагічныя аспекты экалагічнай адукацыі дашкольнікаў. Шляхі станаўлення ўсвядомленага, беражлівага і клапатлівага стаўлення да прыроды ў дзяцей дашкольнага ўзросту разглядаліся ў даследаваннях В.П. Арсенцьевай, В.Г. Грэцовай, Е.І. Золатавай, М.К. Ібраімавай, І.А. Камаровай, А.А. Петрыкевіч і інш. Важныя пытанні закрануты ў кнізе «Родны край» Р.Г. Жукоўскай у якой прапануецца методыка азнаямлення дзяцей з родным краем, з падзеямі і з'явамі грамадскага жыцця. Каштоўны матэрыял, цікавыя заняткі, гульні змяшчаюцца ў кнігах “Экалагічныя заняткі з дзецьмі” Т.М. Бандарэнка і “Сардэчна запрашаем у экалогію!” В.А. Варанкевіч. У іх прадстаўлены канспекты заняткаў па азнаямленні дашкольнікаў з Чырвонай кнігай [2; 3].

Аналіз літаратуры па праблеме даследавання паказаў, што на сённяшні дзень недастаткова распрацовак у галіне азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з жывёламі Рэспублікі Беларусь, занесенымі ў Чырвоную кнігу. Важнасць і актуальнасць разгляданай праблемы вызначылі выбар тэмы даследавання.

Мэта даследавання – вызначыць асаблівасці фарміравання экалагічных уяўленняў пра жывёл, занесеных у чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, у дзяцей у інтэграванай групе.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праводзілася на базе ДУА «Яслі-сад № 89 г. Віцебска» і ДУА «Яслі-сад №11 аграгарадка Малыя Славені, Шклоўскага раёна». Пры правядзенні

даследавання выкарыстоўваліся наступныя метады: канстатуючы эксперымент, якасны і колькасны аналіз атрыманых дадзеных. Для дасягнення мэты даследавання канстатуючы эксперымент быў праведзены як параўнальны. Статыстычная апрацоўка эмпірычных дадзеных ажыццяўлялася з ужываннем праграмы Microsoft Office Excel 2010, Statistica 6.0.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Вывучэнне навукова-метадычнай літаратуры і праведзенае намі эксперыментальнае даследаванне пацвярджаюць важнасць і актуальнасць дадзенай працы.

Выхаванне экалагічна развітога і адукаванага чалавека неабходна пачынаць з дашкольнага ўзросту. Чырвоная кніга – гэта сігнал, які папярэджвае аб тым, што жывёлы і расліны таго ці іншага віду знаходзяцца ў небяспецы, што іх трэба асабліва беражліва ахоўваць і што іх здабыча любымі спосабамі забараняецца. Гэта кніга нашых страт, мінулых і сапраўдных. Не проста сігнал трывогі, а праграма дзеянняў, накіраваных на захаванне каштоўных і рэдкіх жывёл, на павелічэнне іх колькасці. Для гэтага і ствараюцца запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі – гэта значыць асаблівыя ахоўныя тэрыторыі.

Аналіз вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі паказаў, што ў ёй надаецца значная ўвага азнаямленню дашкольнікаў з прыродай з улікам экалагічнай накіраванасці. Варта падкрэсліць, што застаецца мала даследаваным пытанне аб цэласным працэсе экалагічнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту на аснове азнаямлення з жывёламі, занесенымі ў Чырвоную кнігу. Назіраецца супярэчнасць паміж аб'ектыўна ўзрослымі патрабаваннямі грамадства да экалагічнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту і недастатковым выкарыстаннем уяўленняў пра жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу, у эколага-педагагічнай працы дашкольных установ, недастатковай тэарэтычнай распрацаванасцю пытання.

Формы і метады працы з дзецьмі па фарміраванні уяўленняў пра жывёл роднага краю, занесеных у Чырвоную кнігу, вельмі разнастайныя. Сярод іх вылучаюць: заняткі, забавы, урокі дабрыні, урокі мыслення, экалагічныя экскурсіі-экспедыцыі, «Зялёны патруль», абмеркаванне і прайграванне сітуацый, калекцыяніраванне, экалагічныя назіранні, практычную дзейнасць, экалагічныя гульні, экалагічныя выставы і экспазіцыі, экскурсіі, стварэнне Чырвонай кнігі з малюнкаў дзяцей.

З мэтай вывучыць методыку фарміравання экалагічных уяўленняў аб жывёл роднага краю, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, у старэйшых дашкольнікаў у інтэграванай групе ў верасні 2021 года на базе ДУА «Яслі-сад № 89 г. Віцебска» і ДУА Яслі-сад №11 аграгарадка Малыя Славені, Шклоўскага раёна» было праведзена эксперыментальнае даследаванне, якое праходзіла ў 3 этапы.

На 1 этапе (канстатуючы эксперымент) былі падабраны методыкі на выяўленне ўзроўню ведаў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту пра жывёл роднага краю, занесеных у Чырвоную кнігу, праведзена дыягностыка дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту ў інтэграванай групе – эксперыментальнай і кантрольнай групе.

На 2 этапе праведзены эксперымент з мэтай павышэння ўзроўню сфарміраванасці ўяўленняў пра жывёл роднага краю, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, у дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту ў інтэграванай групе.

На 3 этапе (кантрольны эксперымент) была праведзена паўторная дыягностыка ўзроўню ведаў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту пра жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу, па тых жа заданнях, што і на канстатуючым этапе працы.

Кантрольны этап даследавання паказаў, што ў эксперыментальнай групе А: 5 дзяцей (38,5%) маюць высокі ўзровень, 7 дзяцей (53,8%) –сярэдні ўзровень, 1 дзіця (7,7%) мае нізкі ўзровень і вельмі нізкі ўзровень ведаў пра жывёл роднага краю, занесеных у Чырвоную кнігу на заключным этапе даследавання не паказаў ніхто з дзяцей эксперыментальнай групы.

У кантрольнай групе Б: 1 дзіця (7,7%) мае высокі ўзровень, 8 дзяцей (61,5%) – сярэдні ўзровень, 4 чалавека (30,8%) маюць нізкі ўзровень і ніхто не мае вельмі нізкага ўзроўню ведаў пра жывёл роднага краю, занесеных у Чырвоную кнігу.

**Заключэнне.** Зыходзячы з атрыманых дадзеных, можна зрабіць выснову, што праведзеная праца аказала ўплыў на ўзровень сфарміраванасці ведаў пра жывёл роднага краю, занесеных у Чырвоную кнігу, у дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту ў інтэграванай групе.

У выніку кантрольнага эксперыменту відаць, што ў эксперыментальнай групе, дзе была праведзена работа па фарміраванні ведаў пра жывёл роднага краю, занесеных у Чырвоную кнігу, на аснове выкарыстання розных формаў і метадаў, веды дзяцей ўзраслі. У той час у кантрольнай групе веды дзяцей змяніліся нязначна. Характэрным дасягненнем для большасці дзяцей да канца правядзення развіццёвай працы стаў больш высокі ўзровень экалагічнай выхаванасці. Дзіця радуецца сустрэчы з прыродай, жывёламі і раслінамі, эмацыйна адклікаецца на праявы іх жыцця і паводзін. Па ўласнай ініцыятыве доўга назірае за жывымі істотамі. Праяўляе элементарную дапытлівасць: задае разнастайныя пошукавыя пытанні, выказвае эўрыстычныя меркаванні. Валодае першапачатковымі абагульненымі ўяўленнямі аб жывым. Дзіця праяўляе гуманнае стаўленне ў любых абставінах да любой жывой істоты, разумее маральны сэнс сваіх дзеянняў і ўчынкаў.

1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. - Мінск: Нац.Цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2011. – 400 с.
2. Бандарэнка, Г. М. Экалагічныя заняткі з дзецьмі 5-6 гадоў : практыч. дапаможнік для выхавальнікаў і метадыстаў ДОУ / Г.М. Бандарэнка. – 2-е выд., іспр. і доп. – Варонеж: ІП Лакоценін С. С., 2009. – 159 с.
3. Варанкевіч, А. А. Сардэчна запрашаем у экалогію! Парцыяльная прагр. работы па фарміраванні экалагічнай культуры ў дзяцей дашкольнага ўзросту / А. А. Варанкевіч – СПб.: "ДЗЯЦІНСТВА-ПРЭС", 2016. – 512 с.

## АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАНАННЯ ЗАДАННЯЎ ПА ПЕРАЙМАННІ, УЗОРЫ І МАЎЛЕНЧАЙ ІНСТРУКЦЫІ ВУЧНЯМІ ДРУГОГА АДДЗЯЛЕННЯ ДАПАМОЖНАЙ ШКОЛЫ

*Т.С. Кухарэнка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Фарміраванне спосабаў засваення сацыяльнага вопыту выдзелена ў алігафрэнапедагогіке ў якасці незалежнага напрамка карэкцыйна-развіццёвай працы пры лёгкай інтэлектуальнай недастатковасці ў дашкольным узросце, але асаблівасці псіхічнага развіцця дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю абцяжарваюць працэс авалодання імі пераймannем дзеяннямі дарослага, дзеяннямі па ўзоры і маўленчай інструкцыі, што істотна ўскладняе працэс навучання. У працы з навучэнцамі з ўмеранай і цяжкай інтэлектуальнай недастатковасцю дзеянні па пераймання, узоры і маўленчай інструкцыі неабходныя на кожным уроку, на гэта паказвае і змест навучальных праграм і навучальных дапаможнікаў для другога аддзялення дапаможнай школы. Аднак, як паказваюць даследаванні А.А. Катаявай, Е.А. Стрэбелевай гэтыя дзеянні дзецьмі не асвоены [1].

Мэта даследавання – вызначыць асаблівасці выканання заданняў па пераймannі дзеянняў дарослага, ўзоры і маўленчай інструкцыі навучэнцамі I, V класаў другога аддзялення дапаможнай школы.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праводзілася на базе ДУА “Дапаможная школа № 26 г. Віцебска”, ДУА “Дапаможная школа-інтэрнат №10 г. Мінска”, ДУА “Дапаможная школа-інтэрнат № 11 г.Мінска”, ДУА “Яслі-сад № 89 г. Віцебска” і ДУА “Яслі-сад № 17 ім. К.Н. Самойлавай г. Віцебска”. Пры правядзенні даследавання выкарыстоўваліся наступныя метады: канстатуючы эксперымент, якасны і колькасны аналіз атрыманых дадзеных. Для дасягнення мэты даследавання канстатуючы эксперымент быў праведзены як параўнальны – яго заданні выконваліся дзецьмі розных катэгорый.

Статыстычная апрацоўка эмпірычных дадзеных ажыццяўлялася з ужываннем праграмы Microsoft Office Excel 2010, Statistica 6.0.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У даследаванні прынялі ўдзел 21 вучань I класаў і 12 вучняў V класаў другога аддзялення дапаможнай школы (навучэнцы з умеранай і цяжкай інтэлектуальнай недастатковасцю), 27 вучняў I класаў першага аддзялення дапаможнай школы (навучэнцы з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю) і 40 дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту, якія не адносяцца да катэгорыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Даследаванне праводзілася ў верасні–кастрычніку 2021 г. кожнае дзіця індывідуальна выконвала 4 серыі заданняў.

Крытэрамі ацэнкі дзеянняў навучэнцаў ва ўсіх серыях эксперыменту выступалі іх самастойнасць і правільнасць выканання заданняў. Умоўна былі вылучаныя 3 ўзроўню паспяховасці выканання заданняў: нізкі – менш за 50% выканання заданняў, сярэдні-ад 50 да 75% і высокі – выкананне звыш 75% заданняў.